

# РЫЖЫКАЎ (Рыжкоў) ІОСІФ ІВАНАВІЧ

Партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Нарадзіўся 2 верасня 1893 года ў в. Рацава Талачынскага раёна. Скончыў земскае чатырохгадовае вучылішча, якое знаходзілася ў Барках. Жыў у Рызе.

З 1914 года – у царскай арміі. Быў курсантам ваеннай школы аўтамабілістаў (Петраград). Удзельнічаў у баях пад Перамышлем, Варшавай, Люблінам, Баранавічамі. 2 жніўня 1917 года І. І. Рыжыкаву ўручылі партыйны білет. У 20-я гг. плённа працаваў у партыйных арганізацыях Барысаўскага лесапільнага завода, запалкавай фабрыкі «Бярэзіна». У 1934–1937 гг. – член парткалегіі Камісіі партыйнага кантролю пры ЦК ВКП(б) па БССР, наркам лясной прамысловасці БССР.З 1939 года – першы сакратар Гродзенскага РК КП(б)Б, наркам прамысловасці будматэрыялаў БССР.

У гады Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў Маскве, узначальваў Заходнюю аператыўную групу ЦК КП(б)Б і актыўна садзейнічаў развіццю партызанскага руху. У сакавіку 1943 года быў прызначаны намеснікам начальніка Беларускага штаба партызанскага руху і членам Ваеннага савета Калінінскага, 1-га Прыбалтыйскага франтоў.

У 1947–1959 гг. – дэпутат Вярхоўнага Савета БССР. З 1944 года – міністр, з 1953 – першы намеснік міністра жыллёва-грамадзянскага будаўніцтва БССР, гарадскога і сельскага будаўніцтва БССР. У 1958–1959 гг. – намеснік міністра будаўніцтва БССР. Памёр 10 снежня 1979 года. Узнагароджаны ордэнамі Леніна (двойчы) і Кастрычніцкай рэвалюцыі.

**Крыніцы інфармацыі:**


1. **Иосиф Иванович Рыжиков** // Высшее партизанское командование Белоруссии, 1941-1944 / Э. Г. Иоффе [и др.] ; под общ. ред. Э. Г. Иоффе. – Минск : Беларусь, 2009. – С. 51–52.

2. **Карніловіч, Э. А.** На быстрыні жыцця / Э. А. Карніловіч // Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.] ; мастак А. М. Хількевіч. – Мінск : БелЭн імя П. Броўкі, 1988. – С. 627–628.

3. **Корнилович, Э.** Сын партизанской республики / Э. Корнилович // Рэспубліка. – 2013. – 28 верас. – С. 6.

4. **Рыжков Иосиф Иванович** // Регионы Беларуси : энциклопедия : в 7 т. / редкол.: Т. В. Белова [и др.]. – Минск : БелЭн імя П. Броўкі, 2011. – Т. 2 : Витебская область : в 2 кн. – Кн. 2. – С. 425.

5. **Рыжиков Иосиф Иванович** // Память народа : Подлинные документы о Второй Мировой… : [Электронный ресурс]. – Режим доступа : pamyat-naroda.ru.

6. **Сын партизанской республики** : Издательский дом SB.BY : [Электронный ресурс]. – Режим доступа : sb.by›articles/syn-partizanskoy-respubliki.html.